Уладзімір Міхно



...як добра,
калі вяртаецца надзея...

# Трэба круціцца...

***Апавяданьне***

З гары — пад гару, з лагчыны — на ўзвышша бегла дарога. Як і жыцьцё... Ні табе пярэдыху, ні спачыну. І толькі зрэдзьчас дарога станавілася раўнейшай, спакайнейшай. Спадманлівая роўнядзь: быццам бы на хвіліну-другую супакоішся, расслабішся, бывае, нават адпусьціш пагуляць педалі і дасі тайм-аут рулю. Ды нечакана падпільнуе цябе каварная выбоіна на асфальце, здрыганешся, добра, калі пашчасьціць злавіць раўнавагу, але страціш разгон, страціш імклівасьць палёту, апусьціць цябе дарога, і трэба зноўку, напружыўшы ўсё жыльле, абліваючыся халодным гаруча-змазачным потам, паўзьці-падымацца да новае вяршыні.

Не, бегла не дарога. Яна, маўклівая, сталёвая, зьвілістая і доўгая, як вужака, ляжала пад мокрым ад ранішняга туману шэрым асфальтам ды ляніва сіпела пад коламі. А бег па дарозе веласіпед. Дзіва, яны, ба-

дай, ніколі не разлучаліся, бо былі створаны адзін для аднаго і не маглі паасобку жыць, аднак, увесь час ня ладзілі, спрачаліся. Дарога выхвалялася, якая яна гладка-патрэбная і людзям, і машынам і жыцьця без яе не было б. Веласіпед ведаў цану яе балбатні, зрэдку агрызаўся, але болей маўчаў. Лепей з разумным згубіць, чым з дурнем знайсьці. Наезьдзіўся ён і па бездаражы, пратаптаў каляіны ў такой гразюцы-мазюцы, якая ёй, асфальтавай балаболцы, нат і ня сьнілася. Было цяжка, аднак, жыць можна. Раней было дзьве бяды: дарогі і дурні. Дарогі сяк-так падладзілі: наварылі-накаталі асфальту, стала можна езьдзіць. Дарогі падладзілі, а дурні так і засталіся... Няроўна дзеліць Бог. Каторыя спрытнейшыя, больш нахрапістыя ды ўчэпістыя, раскруціліся, селі на «крутыя тачкі», імкліва панесьліся па дарозе, дзе там, не дагоніш! А каб і дагнаў, не паспагадаюць, рукі не пададуць. Хто спакайнейшы ды павагу мае, хто ня ўмее напралом ды па галовах, хто палічыў за лепшае саступіць дарогу, той апынуўся на ўзбочыне, а то і зусім у кювеце. І навошта яму тая гладкая асфальтаваная дарога, якую ўсе хваляць, калі на ёй стала пуста і няўтульна, як і на душы, калі нават аўтобусы, пабаяўшыся тае пустэчы ды няўтульнасьці, перасталі паказвацца ў глухмені. І толькі ён, веласіпед, ня здрадзіў тым самотнікам ды пустэльнікам, што, саступаючы дарогу іншым, апынуліся на яе ўзбочыне, не пакінуў іх. Ён адважна, самаахвярна падставіў ім сваё сталёвае плячо і, натужна парыпваючы педалямі, павёз па крутой дарозе. І ў глыбіні душы ён паважаў сябе за тое, што не збаяўся і ня кінуў іх, калі тым было цяжка і калі ўсе ад іх адвярнуліся. Не ў яго характары кідаць таго, каму патрэбная дапамога, не з яго прынцыпамі адступацца-пасаваць перад цяжкасьцямі.

Бег веласіпед, ня чуючы пад сабою колаў, ды надта не прыглядваўся і не прыслухоўваўся да таго, пра што гугнела яму самалюбівая дарога. Не было часу слухаць. Гаспадару трэ было сьпяшацца ў горад, на працу, дарога далёкая, таму і выехаў ён гэтак рана, на золаку. Густы цёмна-шэры паўзмрок зьліваўся з такім самым шэрым асфальтам, да таго ж, яшчэ нізка пад колы слаўся туман. Хоць вока выкалі, за два крокі нічога не было відаць. І таму трэба быць асьцярожным і пільным – беражонага Бог беражэ. Прымружыўшы катафот, веласіпед уважліва прыглядаўся да белае разьдзяляльнае паласы на дарозе, яе і пільнаваўся. Добра, яшчэ не зіма, хоць асфальт чысты. Зімою, бывала, едзеш уначы, як па струначцы, трымаючыся вузенькай каляінкі, якую прашылі на суцэльным белым кажусе рэдкія машыны-начніцы. Едзеш-каскадзіруеш, перажываеш, баішся, хаця б ня збочыла кола, хаця б не занесла цябе ў глыбокі сьнег, пад якім прытаіўся каварны лядок. Збочыш — і грымнешся вобзем, уверх педалямі, а што, калі пад машыну?!.

Веласіпед ня слухаў дарогі, тая сіпела сабе пад нос. Сіпела, убачыла, што на яе не зважаюць, пакрыўдзілася, раззлавалася, пачала пляваць пад колы халодную асеньняю слотаю. Ціха злаваў і веласіпед. Яму шкада было гаспадара, які мог намачыць чаравікі ды прастудзіцца. Ды што рабіць, хіба дурніцы-дарозе ўкажаш?

Меўшы цягавітае ды моцнае сталёвае плячо, яшчэ надзейны руль і хуткія колы, стары, несучасны веласіпед, аднак, ня меў тае сталёвае волі, якая б дапамагала на жорсткасьць адказваць жорсткасьцю, на зло — подласьцю. Занадта ж мяккаю і пакладнаю, як тая гума на пакрышках, была ў яго душа. Мо таму, што й самога яго зрабілі-зьвіньцілі не на жорсткім бязьлітасным заводскім канвееры, які увесь час кудысьці сьпяшаецца і

ня надта перажывае-задумваецца, хто, якая калека выйдзе з такой сьпешкі, а ўручную, з вялікай душою і любоўю. Было гэта даўно, вельмі даўно, нават і па чалавечых мерках. А веласіпеды дык і ўвогуле столькі не жывуць. Было гэта ў той час, калі на заводах яшчэ ня гналі валу, не трымаліся рэжыму жорсткай эканоміі і, калі яшчэ не адсуверэнітэціліся сумежнікі, не засьмердлася ў карупцыйным балоце чынавенства, не пагрузьлі ў нямытых грашах бізнэсоўцы. Гэта было, калі людзі рабілі не адчэпнага, а дзеля таго, каб нехта паспытаў асалоды ад іхняе працы. Зараз ён, стары рыпучы веласіпед, ужо і сам ня верыць, што такое магло быць. Аднак жа — было!

А потым ён доўга пыліўся на халодным і змрочным «ваенторгаўскім» складзе ў маленькім ваенным гарадку, цярпліва чакаючы, пакуль хтосьці, адшкадаваўшы шэсьцьдзясят рублёў, стане яго гаспадаром. Дзівак, ён спадзяваўся, што будзе служыць якомусьці палкоўніку, ці ў горшым выпадку палкоўніцкаму сынку, што будзе катацца, як сыр у масьле, хоць сабе і не ў сьметанковым, і блішчэць, не раўнуючы як зорачкі на палкоўніцкіх пагонах. Што ж, па маладосьці ўсе мы максімалісты. Не задумваўся юны, бліскучы, стройны прыгажун, якога ражна ён патрэбен палкоўніцкаму сыну, калі той езьдзіць на бацькавых «Жыгулях». Не ж, ён, наіўны донжуаністы франт, прыпылены на складзе, здавалася, ужо ўвачавідкі бачыў, як катае на раме па гарадку прыгожанькіх афіцэрскіх дачушак, і ад такіх фантазіяў даходзіў ледзьве не да экстазу, адчуваючы прыемную напругу калянага ў салідоле ланцуга.

Мы выбіраем — нас выбіраюць... Шэсьцьдзясят рублёў адшкадаваў хлопец з суседняе вёскі, якому бедныя бацькі-калгасьнікі сабралі грошы на веласіпед. Грошы па тым часе былі немалыя. А хлопцу ішла васемнаццатая вясна.

І паехаў велік у вёску! Дзіва, яго ніхто ў той час не зьбіраў у дарогу, нават не падкруціў ніводнае гайкі. Ён быў новенькі і гатовенькі, як з печы выняты. Хлопец дастаў з кішэні анучку, выцер яму пыл са сьпіны, ласкава пагладзіў па сядлу і, асядлаўшы, галопам панёсься па шашы.

— Ну, мой сталёвы конік, не падводзь! — весела крыкнуў па дарозе яго гаспадар.

Велік яшчэ ня ведаў тады, што гэтыя словы былі ня так сабе словалі хлапечай радасьці, і што неўзабаве яны стануць малітваю. Ён хутка прывык да свайго гаспадара, хлопца вясёлага, добрага душою. Цэлымі днямі той не расставаўся са сваім «сталёвым конікам», то езьдзілі купацца на рэчку, то ганялі ў горад на базар, а то адвячоркам зьбіраліся ў суседнюю вёску, у клуб, на танцы. Вельмі ж любіў велік такія вечары, аж зьзяў ад шчасьця, во дзе наслухаўся музыкі, што даносілася з адчыненых дзьвярэй клуба, калі паслухмяна чакаў пад акном свайго гаспадара, во дзе накатаўся з дзяўчатамі па цёмных і брудных вясковых завулках. Дзяўчаткі пішчэлі ад страху, калі пад колы траплялася якая калюжына, а ён, гарэза, аж крактаў ад задавальненьня. Баламут і шырокая душа, гаспадар яго ніколі не зажыльваў, заўсёды даваў катацца сябрам і знаёмым, і ганяла на веліку ці ня ўся вясковая моладзь.

Кажуць, жонку і тэхніку па чужых руках не пускай. Толку ня будзе. За вясну, за лета стаптаўся-зьезьдзіўся велік. Хоць быў ён новы, і добра скроены ды моцна сшыты, але ж і ганялі на ім! Сядалі па-двое, па-трое, выціскалі з яго, бедалагі, усё, што льга, насіліся навыперадкі, гвалтам ціскаючы педалі, тармазілі, аж дымам курэла гума, было, што і куляліся са стромай гары. Вядома ж, веліку балела: нылі растаптаныя педалі, саднілі сьцёртыя пакрышкі ды паламаныя сьпіцы. Было, што разам з гаспада-

ром, кульнуўшыся, зьбівалі сабе лабаціну аж да крыві і да грунтоўкі і падоўгу насілі «ліхтары» і мелі разьбітыя катафоты. Ды ў маладых хутка зажывае. Велік ніколі ня плакаў і не стагнаў, ён мужна, як і гаспадар, пераносіў «баявыя раненьні». Зрэшты, яны яшчэ ня ведалі тады, што такое вайна...

А ўвосень гаспадару прыйшла позва з ваенкамату. Дагуляліся! Велік і ня ведаў бы нічога, калі б аднаго разу гаспадар не зайшоў у гараж на добрым падпітку. Зьдзіvіўся, ён, бадай, ніколі ня бачыў гаспадара такім зьбянтэжана-самотным і па-дзіцячы бездапаможным. Той, абмакнуўшы пальцы ў салідол, ласкава, пяшчотна гладзіў яго па ланцугу, змахваў дарожны пыл з зорачак і ўтулак, улагоджваў гайкі і балты:

— Трэ было б перабраць цябе, конь мой, — апраўдваўся гаспадар — даруй, дружбан, не пасьпеў! Пайду заўтра... А ты чакай мяне. Два гады — ня ліха, абы было ціха. «Жди меня и я вернусь, только очень жди...» Вярнуся — зраблю, як новенькага, абяцаю...

Абяцанкі-цацанкі, а дурню радасьць... Гаспадар павыкручваў ніпелі, выпусьціўшы паветра з камераў, падвесіў велік за хрыбет на два вялізныя крукі на сьцяне, каб, чаго добрага, мышы не дабраліся да гумы, і — зьнік... І велік пачаў чакаць. Назаўтра ён пачуў у хаце музыку, але не такую, якую, бывала, слухаў ля клуба. Заплаканы гармонік граў «Разьвітаньне славянкі». Хтосьці засьпяваў прыпеўкі, хацеў гарэзьліва, задорна, а выйшла самотна і трывожна, бадай, як на хаўтурах. А потым загула машына, усхліпнула гаспадарова маці і — усё сьціхла...

Гулкая, гнятлівая цішыня надоўга, здавалася, назусім накрыла гараж, напаўзьлі на яго цемра і адчай. Не было каму болей адчыніць сюды дзьверы, каб хаця запусьціць праменьчык сьвятла. Адно за сьцяною сакаталі куры, а ўнізе зрэдзьчас галёкалі пацукі. Хто ніколі не вісеў на круках у такой вось магільнай цішыні і цемры, той не зразумее... І велік, мабыць, ня вытрымаў бы, хоць і жалезны. Нават і жалезнаму сэрцу непамысна вытрымаць адзіноту. Ня вытрымаў бы, калі б праз усю доўгую росстань не азываліся ў ім металам, як заклён, гаспадаровы словы: «Жди меня и я вернусь, только очень жди...» Сьмерць прыходзіць не тады, калі ты фізічна перастаеш існаваць, а тады, калі табе ў жыцьці не застаецца каго чакаць...

Ён ведаў, каго чакае, і ён дачакаўся. Колькі мінула часу, мо два гады, а мо цэлая вечнасьць, велік ня помніць, ды аднойчы разам з яркім сонечным сьвятлом у гараж зайшоў немалады чалавек. Але хто ж гэта? І што яму патрэбна? Нетаропкі, ссутулены, учарнелы з твару, збуцьвелы ў густой чорнай шчаціне — ці ж гэта быў яго гаспадар?!

— Што, не пазнаў? — змрочна ўздыхнуў той, дрыжачай рукой высільваючыся вывудзіць з кішэні пачак цыгарэт. — Ды я, брат, і сам сябе не пазнаю, — ён неяк ненатуральна, нязграбна, аберуч ухапіўся за пачак, паднёс да роту і пачаў зубамі даставаць цыгарэту, — вось як бывае, дружа...

Велік зірнуў на яго далоні і... мурашкі пабеглі па хрыбціне. Далоні былі чорныя, каляныя і бліскучыя, як яго скуранное сядло. Пальцы ня гнуліся. Ён усё зразумеў.

— Хіба прадаць цябе? — тым часам уголас разважаў гаспадар. — Навошта ты мне цяпер? Ды хто купіць? Саржавеў ты ўвесь вунь... разьбіты-раздоўбаны... Э-эх! Колькі ж мы з табой, брат, паезьдзілі... Так і не перабраў цябе... Не пасьпеў... Ужо й не перабяру... Выбачай, конь мой. Бачыш, як мяне «духі» на «расьцяжцы» перабралі?.. — ён скрыві-

ўся, каб не заплакаць, ды мужная сьлязіна ўсё роўна ціха папаўзла па шчацэ, балазе, яе не было каму змахнуць...

І велік зразумеў, што гэта фініш, гэта сьмерць. Сапраўды, навошта калеку веласіпед, тым болей, іржавы, дабіты? А калі і ўспрытніцца гаспадар езьдзіць бяз рук, то купіць сабе новенькі, надзейны, мо шматхуткасны. Ён зразумеў, што болей няма чаго і каго чакаць, няма на што спадзявацца, застаецца ціха, пакутна і доўга канаць, разапнутым на круках. Зноў цугам пацягнуліся гады. Ня помніць, колькі з іх мінула-праляцела, бо яго сьвядомасьць перастала ўспрымаць рэчаіснасьць і быць падуладнай часу, а жалезнае сэрца пакрылася безнадзейнаю іржою абыякавасьці. Як праз сон ён бачыў сваіх пераемнікаў, якія адзін за другім паяўляліся ў гаражы, маладыя, бліскучыя, адзін за аднаго прыгажэй, канкурэнты пазіралі на яго, старога ды іржавага, бездапаможна разапнутага на круках, з насьмешкаю, з прыкрасьцю. Так часта маладыя пазіраюць на старых і зьнямоглых, не задумваючыся, што гэткі ж лёс чакае некалі і іх саміх. Зрэшты, велік не асуджаў ні іх, неразумных падлеткаў, ні гаспадара, які, знайшоўшы ў сабе сілы вярнуцца да жыцьця пасьля цяжкіх выпрабаваньняў, перасеў на іншую тэхніку і так лёгка расстаўся з ім, сваім лепшым і самым надзейным сябрам юнацтва. А мо яму балеў бы ўспамін пра тое самае бязвоблачнае юнацтва, калі ён быў здаровым і запатрабаваным? А непрыемным успамінам мог стаць стары веласіпед. Не, ён не асуджаў. Людзі жывуць па сваіх, і зусім не па жалезных законах, кіруюцца ўсім не сталёвымі прынцыпамі. А мо і асуджаць ужо не ставала сілаў? Зьнясілеў небарака, моцы хапала толькі зьдзіўляцца, як хутка зьнікаюць з гаражу яго маладыя пераемнікі. Не перазімаваўшы і дзьвюх зімаў, яны рассыпаліся проста на вачах, згнівалі дашчэнту. Сыпаліся сьпіцы ды падшыпнікі, гнуліся рамы, падгнівалі сёдлы з багажнікамі, здрадліва лупілася завадская фарба. Ну і моладзь пайшла! Лядашчая, гнілая, няшчасная і абяздоленая ад нараджэньня. Ад ветру хіліцца, ад марозу рассыпаецца. Мусіць жа, і падарожнічае гаспадар багата, калі так сыплецца ў яго пад нагамі маладняк. Гэта адно, а другое, сваіх рук ня меўшы, чужымі тэхніку не дагледзіш. Пакінуты і забыты ў гаражы, не здагадваўся стары веласіпед, што рассыпалася тым часам цэлая краіна, дзе ён нарадзіўся, дашчэнту праржавеўшы ды пакарабаціўшыся ад хлусьні, двурушніцтва і ўрэшце сама сябе зьеўшы. Ён ня ведаў, што старое грамадства рассыпалася і згніло, а новае паяўляецца на белы сьвет чарвівым ад нараджэньня, бо скуль яму здароваму брацца?..

І ўсё ж ён дачакаўся свайго сьветлага дня. Ужо і не спадзяваўся, калі гаспадар зайшоў раптам у гараж са сваім баявым сябрам.

Яны разаслалі газеціну, паставілі пляшку гарэлкі і дзьве гранёныя чаркі, паклалі колькі маласольных агуркоў, прыселі.

— Ну, будзьма, за нас з табой і хрэн з імі! І хай здохне той, хто нас ня любіць! — падняў чарку гаспадар.

— Але ж і ня любяць. Не дачакаюцца, пакуль мы здырдзімся, забраўшы на той сьвет крыўды свае... Замінаем, як бы ім дарогу перайшлі... Слухай, ты казаў, у цябе велік рассыпаўся. А гэта што? — кіўнуў сябар на сьцяну.

— Гэта стары мой конь!.. На танцы хлопцам на ім яшчэ езьдзіў.

— Стары, кажаш? Ды я б такога на двух маладых не памяняў. Зірні, як раней рабілі: руль блішчыць, бы ўчора з заводу, нікелю не шкадавалі, ня тое, што зараз, алюмініевы прылепяць і за зіму пачарнее, зорачкі вунь як сьвецяцца, а тоўстыя, трывалыя, багажнік на ўсе сто, нават шчыткі захаваліся, бадай, як новыя.

— Педалі ўжо раздоўбаныя, ланцуг расьцягнуўся, падшыпнікі паляцелі...

— Педалі, ланцуг — ерунда, зьменім, у мяне ёсьць запасныя, таксама са старога. Ты лепей зірні, якая рама трывушчая, такіх двух, як ты, кабаноў вытрымае. Давай, я зраблю табе яго, будзе як новенькі...

— Зрабі ласку! Божа мой, няўжо і ты, мой стары конь, спатрэбіўся — на органы? — усьміхнуўся шчасьлівы гаспадар.

— Якія, брат, органы?! Сплюнь! Ён і сам яшчэ пабегае… Колькі ж яму? Гадоў дваццаць? Што, значыць, яшчэ за Саветамі зроблены...

— Душу мацьіх тых саветаў! Мы цябе, сказалі, у Афган не пасылалі. А што я туды сам пабег, каб бяз рук застацца? Мо зараз бы на «Мерсе» якім разьязджаў, у бізнэсоўцы запісаўшыся, бабкі рабіў бы, а не педалі круціў...

— З цябе бізнэсовец, даруй, як з казла сьвіньня. Не прадажны ты, брат, вось што я табе скажу. Сам не прадаеш, і другім прадавацца не прывык. А з такімі прынцыпамі век табе на веліку езьдзіць.

— Вот я і кажу, выхавалі, мацьіх, Саветы. На базар завезьці сваю бульбіну прадаць і то як бы штось сорамна. Недавяркамі нейкімі павыхоўвалі нас. А моладзь вунь ня сьпіць у шапку. Ражна ня бачыўшы, самога Бога за бараду ўхапіць успрытнілася...

— Кідай бурчэць, благі свёкар, нясі лепей інструмант. Зараз мы яго перабярэм...

...І веласіпед аджыў, хаця па-любому не павінен быў вярнуцца з забыцьця і небыцьця. Ён глядзеў на двух барадатых дзівакоў, якія, вызваліўшы яго з крукаватай дыбы, нібы з палону, асьцярожна, як нябожчыка, вынесьлі да сонца, паклалі на мурожную траўку, бы на аперацыйны стол, вярталі да жыцьця, глядзеў і ня верыў вачам сваім. Душа яго яшчэ лунала ўверсе, зьдзіўлена звысака пазіраючы на бездапаможнае цела, а надзея ўжо вярталася. Як добра, калі вяртаецца надзея!..

З гары — пад гару, з лагчыны — на ўзвышша... Стогнуць педалі, пацее ад напругі ды вялікай адказнасьці руль. Змоўкні, дарога! Не сіпі, ня плюйся! Табе — ляжаць, а тут — чалавека везьці. Чалавека, для якога ты сам — яго рукі, яго галава, яго кавалак хлеба надзёйнага, яго лёс.

— Ну, мой сталёвы конік, не падводзь! Мы яшчэ паваюем, ці ня так?

Гаспадар нярвова пазірае на гадзіньнік, бо спазьняецца на працу. Дарога-здрадніца, праглынуўшы порцыю халоднага туманнага кактэйлю, раптам перастае плявацца слотаю і на вачах ператвараецца ў коўзанку, зьдзекліва сьмяецца ад злога задавальненьня, аж зьзяе. Сустрэчная машына нахабна вырачыла фары і нават ня думае ўключаць бліжняе сьвятло. Маўляў, едзе нейкі калека насустрач на двух ламаных колах, было б перад кім шапку здымаць. Дзьве фары-сафіты ў вочы і едзеш, як у яме, у воглай, бяздоннай цемры. Задушная, церпкая, сасьмердлая ад бензінавых пароў хваля моцна б'е па нагах, здрадлівы лёд разводзіць колы. І — гумавыя, нягнуткія рукі гаспадара, для адчэпнага, павісьлі на рулі. Не для слабых нерваў... Няўжо едзеш у нікуды?!.

Не ж, мой гаспадар, мы яшчэ паваюем! Толькі б не рассыпацца, не расклеіцца па дарозе. Не трашчы, ланцуг, не зьвівайся «васьмёркаю» кола, трымайцеся, педалькі, цярпіце, даражэнькія. Ня падаць! Ня падаць! Мы бяз рук, нас няма каму склеіць, сабраць, наладзіць у дарозе. А дарога жыцьця — вунь якая доўгая, вунь якая коўзкая ды цёмная. І прасьвету нідзе не відно. І яшчэ да сьвітаньня далёка. І ніхто ня ўважыць, не саступіць на дарозе той. Але трэба круціцца, круціцца, каб выжыць. Хочаш жыць — умей круціцца...